**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2017 г.**

**<u>Мерапрыемствы да 500 – годдзя беларускага кнігадрукавання</u>**

**12 красавіка**

Для навучэнцаў старэйшых класаў ДУА "Гарадзецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа" прайшла духоўна-асветніцкая гадзіна "Духовные истоки – начатое Скориной", прысвечаная 500-годдзю беларускага друкарства. Іерэй Георгій Чарвякоўскі пазнаёміў прысутных са старажытнымі кнігамі, што захоўваюцца ў прыходскім храме. Бібліятэкары прадставілі літаратурную кампазіцыю "И вечным останется слово" і мультымедыйную прэзентацыю, прысвечаную асветніцкай дзейнасці Францыска Скарыны.

Гарадзецкі філіял, 44 чал.

**20 красавіка**

Гасцямі гадзіны духоўнасці "Духовной книги благодать" сталі навучэнцы старэйшых класаў гімназіі. Сумесна з супрацоўнікамі бібліятэкі юнакі пазналі пра жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны. Протаіерэй Свята-Петрапаўлаўскага храма айцец Сергій паведаў пра Святое пісанне, пра гісторыю стварэння Біблії. Завяршылася мерапрыемства віктарынай.

ЦБ, 62 чал.

**<u>Мерапрыемствы да Вялікодных свят</u>**

**16 красавіка**

На выступленні літаратурна-паэтычнай групы "Крыніца" "Пасха весны и радости" карыстальнікам публічнай бібляэкі расказалі аб гісторыі свята, яго традыцыях і звычаях, пачаставалі прысутных фарбаванымі яйцамі і кулічамі. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці Дома культуры прадставілі святочную праграму. Падрыхтавана кніжная выстава "Праздников праздник - Пасха".

Навасёлкаўская ПБ, 50 чал.

**16 красавіка**

Удзельнікі пасяджэння аматарскага клуба "Цудоўныя імгненні" ў суправаджэнні відэапрэзентацыі "Пасха - Светлое Воскресение Христово" здзейснілі экскурс у гісторыю святкавання Вялікадня, пазнаёміліся з традыцыямі і сімваламі свята, падзяліліся сваімі рэцэптамі афарбоўвання яек. Падчас правядзення мерапрыемства члены клуба прымалі актыўны ўдзел у конкурсах і адказвалі на пытанні віктарыны. Завяршальным акордам сустрэчы стала традыцыйнае чаяванне з велікоднымі кулічамі.

Хабовіцкая ПБ, 19 чал.

**26 красавіка**

Бібліятэкай сумесна з клубам і нядзельнай школай храма Ушэсця Гасподня аграгарадка Гарадзец праведзены святочны вечар "Пасхальный перезвон". Дзеці і дарослыя слухалі велікодныя песні і вершы, глядзелі тэатралізаванае прадстаўленне "Золотое яичко", слухалі словы віншавання ад іерэя Георгія

Чарвякоўскага і старшыні Гарадзецкага сельвыканкама Д. Н. Міраненкі. Усім прысутным было прапанавана прыняць ўдзел у разнастайных конкурсах, віктарынах, тэматычных гульнях “Катись яичко”, “Горячее яйцо”, “Крученое яйцо”. Пераможцы і ўдзельнікі гульнявой праграмы атрымалі салодкія велікодныя пачастункі.

Гарадзецкі філіял, 78 чал.

**26 красавік**

Члены аматарскага клуба “Крынічка” сумесна з нядзельнай школай выступілі з літаратурна-музычнай кампазіцыяй “Пасхальный Благовест”. Дзеці расказалі пра гісторыю свята, разам з працаўнікамі Дома культуры выканалі велікодныя песні. Настаяцель Свята-Петрапаўлаўскага храма г. Кобрына айцец Аляксандр павіншаваў усіх прысутных са святам, а карыстальнікам бібліятэкі падарыў падпіску на праваслаўныя часопісы і газеты. Падрыхтавана кніжная выстава і выстава вырабаў “Пасхальная радость”, відэапрэзентацыя “Христос Воскрес”.

Залеская ПБ, 150 чал.

## <u>Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароў’я</u>

**2 красавіка**

На урок здароўя “Я здароўе берагу – сам сабе дапамагу” сабраліся навучэнцы сярэдніх і старэйшых класаў Шамятоўскай СШ. Увазе прысутных прадстаўлена кніжная выстава “Сбереги себя для жизни”, прапанаваны спіс выданняў па здароваму ладу жыцця, праведзены конкурсы “Збяры пасловіцу і растлумач яе сэнс”, “Глаза – зеркало души» , “ В здоровом теле – здоровый дух”, “Сценический” , “Ослепительная улыбка”, “Загадки”, “”Здоровье”, “Приятного аппетита”, “Пословицы и поговорки о здоровье”, гульня “ Это я, это я, это все мои друзья “ і інш. На працягу мерапрыемства выкарыстоўваліся камп’ютарныя слайды па тэматыцы здаровага ладу жыцця.

Шамятоўская ПБ, 26 чал.

**10 красавіка**

"Мы за здаровы лад жыцця!"- пад такой назвай прайшла конкурсна-гульнявая праграма для маленькіх карыстальнікаў бібліятэкі. Каманды "Пазітыў" і "Сяброўства" спаборнічалі ў конкурсах: "Здароўе", "Народная мудрасць абвяшчае...", "Веды-сіла". Кніжная выстава "Компас у краіну здароўя" пазнаёміла дзяцей з літаратурай пра здаровы лад жыцця.

Балоцкая ПБ, 35 чал.

**26 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла гадзіна перасцярогі “Три ступени, ведущие вниз”. Навучэнцам старэйшых класаў СШ №2 расказалі пра ўплыў згубных звычак на здароўе чалавека, пра вынікі курэння, алкагалізму і наркаманіі. У канцы мерапрыемства прысутныя праглядзелі тэматычны відэаролік.

ЦБ, 54 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках абласной прафілактычнай акцыі “Полезные каникулы”

**2 красавіка**

У рамках акцыі **“Полезные каникулы”** прайшла літаратурная гульня-вандраванне “Казачны калейдаскоп”. Каб трапіць у казачны замак дзецям давялося пераадолець шэраг перашкод: расшыфраваць тэлеграмы, пазнаць згубленыя рэчы, літаратурных герояў, адгадаць загадкі, скласці сваю казку і інш. Любімых герояў дзеці сустрэлі на выставе “Добрыя кнігі – сябры назаўжды”. Лепшыя знаўцы казак атрымалі прызы.

Залеская ПБ, 30 чал.

**2 красавіка**

Навучэнцы школьных лагераў СШ №1, № 6 атрымалі шмат карыснай інфармацыі пры правядзенні ўрока здароўя “Не в радость без здоровья жить – им нужно с детства дорожить”. Героі лялечнага спектакля “Слагаемые здоровья” ў гульнявой форме паднеслі дзецям шэраг карысных парад для захавання здароўя. Для самых маленькіх чытачоў супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі ўрок-вандраванне “Библиотеку посещаем – любовь к книге прививаем”. Дзеці актыўна прымалі ўдзел у конкурсна-гульнявой праграме “Мы будем сказки узнавать, шутить, отгадывать, играть”.

Дзіцячы філіял, 128 чал.

**2 красавіка**

Юныя чытачы сталі ўдзельнікамі свята “Падарожжа ў Чытай-галактыку”, дзе пабывалі на многіх бібліятэчных планетах. Прымалі актыўны ўдзел у інтэлектуальных гульнях і конкурсах, прысвечаных Году навукі. Спадабалася дзецям забаўляльная праграма “Адчыняе дзверы казка” з элементамі тэатралізацыі, экскурсія ў Дом рамёстваў, дзе яны і пазнаёміліся з рознымі выглядамі народнай творчасці. Маленькія кнігалюбы падрыхтавалі віншаванні і музычныя падарункі кнігам, а бібліятэцы падарылі свае малюнкі.

Дзівінскі філіял, 77 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**3 красавіка**

Гасцямі літаратурна-тэматычнага вечара “Дружба народов – дружба литератур” сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага ліцэя сферы абслугоўвання і чытачы бібліятэкі. Вядучыя расказалі пра гісторыю свята, пра літаратуру дзвюх краін. Для гасцей падрыхтавана канцэртная праграма ў выкананні І. Асіпук і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Арэхаўскага СДК. Свае вершы прысутным прачытала член народнага аматарскага аб'яднання “Белы бусел” В.І. Літошык.

ЦБ, 48 чал.

**6 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла пазнавальная гадзіна “Семь чудес Беларуси”. Гасцямі мерапрыемства сталі падапечныя ТЦСАН. Супрацоўнікі бібліятэкі разам з гасцямі здзейснілі вандраванне па выдатным мясцінам краіны: Белавежскай пушчы, Брэсцкай крэпасці, Сафійскім саборы, Мірскім замку і інш.

ЦБ, 18 чал.

**18 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры ЦРБ адбылася прэзентацыя зборніка артыкулаў «Карані і кроны», падрыхтаванага ўдзельнікамі гісторыка-краязнаўчай секцыі «Кобрынскі ключ» Універсітэта залатога ўзросту. Зборнік змяшчае матэрыялы пра малавядомыя старонкі ў гісторыі Кобрыншчыны 30-60 гг. ХХ стагоддзя. Гасцямі вечара сталі: рэдактар і карэктар зборніка Н.П. Ефціфеева, аўтары: І.Э. Сіманава, Б.Г. Купак, Н.Г. Марчук, А.К. Шыдлоўскі, У.Е. Бодзюг, а таксама настаўнікі і краязнаўцы. Сустрэча суправаджалася відэапрэзентацыяй.

ЦБ, 62 чал.

**27 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшоў урок прававых ведаў “Каждый вправе знать о праве”, прысвечаны 15-годдзю з часу функцыянавання пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы Публічнага цэнтра прававой інфармацыі (ПЦПІ). Працаўнік рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Брэсцкай вобласці В. А. Галавей падарыла бібліятэцы шэраг кодэксаў Рэспублікі Беларусь і іншыя выданні прававой тэматыкі. Удзельнікі мерапрыемства - навучэнцы палітэхнічнага коледжа г. Кобрына - прынялі актыўны ўдзел у віктарыне, конкурсе, а таксама ў прававым трэнінгу “Работа со справочно-правовой системой “ЭТАЛОН-WIN” і самастойна паспрабавалі знайсці нарматыўна-прававыя дакументы.

ЦБ, 74 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81